**Лаўрэаты прэмій імя акадэміка А.В.Лыкава 2005 года**

Пастановай Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ад 7 ліпеня 2005 г. № 56 "Аб прысуджэнні прэмій імя акадэміка А.В.Лыкава 2005 года":

Прэмія імя акадэміка А.В.Лыкава 2005 года айчынным вучоным прысуджана за цыкл работ "**Цепла- і масаперанос у неаднародных асяроддзях з улікам гідрадынамікі, фазавых і хімічных пераўтварэнняў**":

**Барадулі Валянціну Аляксеевічу**, загадчыку лабараторыі Інстытута цепла-і масабмену імя А.В.Лыкава НАН Беларусі, члену-карэспандэнту НАН Беларусі, доктару тэхнічных навук – за развіццё даследаванняў у галіне працэсаў пераносу пры фазавых і хімічных ператварэннях у дысперсных асяроддзях;

**Васільеву Леанарду Леанідавічу**, загадчыку лабараторыі Інстытута цепла-і масаабмену імя А.В.Лыкава НАН Беларусі, доктару тэхнічных навук – за развіццё даследаванняў у галіне працэсаў пераносу пры фазавых і хімічных ператварэннях у капілярна-порыстых целах;

**Мартыненку Алегу Рыгоравічу**, дырэктару НІРУП "Энергетычная стратэгія" Міністэрства энергетыкі Рэспублікі Беларусь, акадэміку, доктару тэхнічных навук – за развіццё даследаванняў у галіне канвектыўнага цеплаабмену;

**Міхалевічу Аляксандру Аляксандравічу**, галоўнаму навуковаму Супрацоўніку Інстытута цепла-і масаабмену імя А.В.Лыкава НАН Беларусі, акадэміку, доктару тэхнічных навук – за развіццё фенаменалагічнай тэорыі цепламасаабмену пры фізіка-хімічных ператварэннях;

**Шашкову Анатолію Герасімавічу**, галоўнаму навуковаму супрацоўніку Інстытута цепла-і масаабмену імя А.В.Лыкава НАН Беларусі, акадэміку, доктару тэхнічных навук – за развіццё даследаванняў цеплафізічных уласцівасцей газаў і цвёрдых рэчываў;

**Шульману Зіновію Пінхусавічу**, галоўнаму навуковаму супрацоўніку Інстытута цепла- і масаабмену імя А.В.Лыкава НАН Беларусі, доктару тэхнічных навук – за развіццё даследаванняў у галіне рэадынамікі і цепла- і масапераносу ў нельютанаўскіх вадкасцях і рэалагічна складаных сістэмах.

Прэмія імя акадэміка А.В.Лыкава 2005 года міжнароднаму калектыву прысуджана **за цыкл работ "Тэарэтычныя і эксперыментальныя метады даследаванняў працэсаў цеплаправоднасці і сушкі і іх выкарыстанне ў прамысловых цеплатэхналогіях"**:

**Цімашпольскаму Уладзіміру Ісаакавічу**, намесніку Старшыні Прэзідыума НАН Беларусі, доктару тэхнічных навук – за развіццё даследаванняў у галіне цеплафізікі і тэрмамеханікі, энергэрэсурсазберагальных тэхналагічных працэсаў, рашэнне нелінейных задач крышталізацыі і плаўлення з рухомымі межамі;

**Самайловічу Юрыю Аўраамавічу**, дырэктару НВП "Платан" (г. Екацярынбург, Расійская Федэрацыя) – за развіццё даследаванняў у галіне

цеплафізікі і гідрадынамікі пры фарміраванні і крышталізацыі стальных вырабаў;

**Пастольніку Юрыю Сцяпанавічу**, прафесару Дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта (г. Днепрадзяржынск, Украіна), доктару тэхнічных навук, – за развіццё даследаванняў у галіне цеплафізікі і тэрмамеханікі энергарэсурсазберагальных тэхналагічных працэсаў;

**Карташову Эдуарду Міхайлавічу**, дэкану факультэта прыкладной матэматыкі Маскоўскай акадэміі тонкай хімічнай тэхналогіі, доктару фізіка-матэматычных навук (г. Масква, Расійская Федэрацыя) – за ўклад у вырашэнне задач цеплаправоднасці;

**Далінскаму Анатолію Андрэевічу**, дырэктару Інстытута тэхнічнай цеплафізікі НАН Украіны, акадэміку НАН Украіны, доктару тэхнічных навук (г. Кіеў, Украіна) – за развіццё даследаванняў у галіне сушкі і тэрмаапрацоўкі матэрыялаў, уклад у фундаментальныя і прыкладныя даследаванні ўзаемазлучанага цепла- і масапераносу;

**Куцу Паўлу Сцяпанавічу**, галоўнаму навуковаму супрацоўніку Інстытута цепла- і масаабмену імя А.В. Лыкава НАН Беларусі, доктару тэхнічных навук – за развіццё даследаванняў у галіне сушкі і тэрмаапрацоўкі матэрыялаў.